# КАБ НІХТО НЕ САПСАВАЎ СВЯТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах прадстаўніка МУС, палова месцаў, дзе размешчаны ўчасткі для галасавання, будуць абсталяваны сістэмамі відэаназірання рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі: «Сёння праводзяцца дадатковыя інструктажы па парадку нясення службы з асабовым складам, арганізавана адпрацоўка тыпавых алгарытмаў дзеянняў ва ўзаемадзеянні са старшынямі выбарчых камісій. Акрамя таго, Дзяржаўтаінспекцыяй абследавана вулічна-дарожная сетка, забяспечаны кантроль за прывядзеннем дарожнымі і камунальнымі арганізацыямі праезнай часткі і тратуараў у належны стан». Аляксандр Купчэня звярнуў увагу на выкананне правілаў стаянкі і прыпынку паблізу выбарчых участкаў. З боку супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі будзе забяспечаны пастаянны кантроль, будуць прымацца меры ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Асноўныя намаганні сканцэнтраваны на забеспячэнні правапарадку непасрэдна падчас галасавання выбаршчыкаў. «З 20 студзеня асабовы склад органаў унутраных спраў і ваеннаслужачых унутраных войскаў пераводзіцца на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Для каардынацыі дзеянняў асабовага складу, збору і аналізу інфармацыі прадугледжана функцыянаванне аператыўна-сітуацыйных штабоў на ўсіх узроўнях. Канцэпцыяй забеспячэння бяспекі прадугледжана кругласутачнае нясенне службы асабовага складу на ўсіх участках для галасавання шляхам выстаўлення пастоў. Міліцыянеры будуць знаходзіцца паблізу памяшканняў для галасавання ў гатоўнасці зрэагаваць і аказаць неабходнае садзейнічанне камісіям у падтрыманні парадку. Акрамя таго, да месцаў правядзення галасавання таксама будуць набліжаны нарады адзінай дыслакацыі. Мы прадугледжваем дадатковыя мабільныя групы і групы хуткага рэагавання ў поўнай экіпіроўцы з аўтаматычнай зброяй, што будуць гатовы аказаць імгненную дапамогу».

Як адзначыў спікер, дзякуючы названым мерам, ні адно правапарушэнне, ні адно супрацьпраўнае дзеянне не застанецца па-за ўвагай. Для забеспячэння рэагавання на магчымыя правакацыі, аказання дапамогі і садзейнічання супрацоўнікам органаў унутраных спраў будуць прыцягвацца члены добраахвотных дружын, ветэраны органаў унутраных спраў і прадстаўнікі БРСМ. Акрамя таго, будзе забяспечана бяспека членаў выбарчых камісій пры перавозцы бюлетэняў, а таксама пры працэдуры галасавання асобных катэгорый грамадзян па месцы жыхарства.

«З улікам вопыту мінулых гадоў пад асаблівай увагай будзе любая інфармацыя, якая змяшчае пагрозы або абразы ў дачыненні да членаў выбарчых камісій або старшынях камісій. Кожнаму такому факту будзе давацца імгненная ацэнка і прымацца меры рэагавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Хачу яшчэ раз звярнуць увагу, што аператыўна-прафілактычныя мерапрыемствы па выяўленні і фіксацыі такіх правапарушэнняў працягваюцца і знаходзяцца на пастаянным кантролі. Меры, якія прымаюцца, дазволяць забяспечыць своечасовае рэагаванне ў выпадку ўскладнення аператыўнай абстаноўкі. Органы ўнутраных спраў гатовыя да выканання пастаўленых задач», — падагульніў Аляксандр Купчэня.

## «НЕ ТОЛЬКІ КАНТРОЛЬ, АЛЕ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ...»

Міністрам па надзвычайных сітуацыях прынята адпаведнае рашэнне аб арганізацыі работы падрыхтоўкі правядзення выбараў, якім прадугледжаны комплекс мер, што ўключаюць работу па прафілактыцы ўзнікнення надзвычайных сітуацый, а таксама аператыўнага рэагавання. Аб гэтым расказаў **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аварыйна-ратавальных службаў і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Аляксей НАВІЦКІ**: «Органамі дзяржаўнага пажарнага нагляду забяспечана правядзенне абследаванняў супрацьпажарнага стану больш за 4,5 тысячы аб'ектаў, на якіх будуць размяшчацца выбарчыя ўчасткі. З мэтай павышэння ўзроўню пажарнай бяспекі работнікамі МНС аказана ўся неабходная практычная дапамога, праведзены адпаведныя інструктажы аб мерах пажарнай бяспекі».

Па яго словах, у падраздзяленнях МНС праведзена больш за чатыры тысячы заняткаў з ратавальнікамі і з работнікамі дзяжурных змен па тактыцы тушэння пажараў на тыпавых аб'ектах, якія будуць размяшчацца ў выбарчых участках. У тым ліку дадаткова вывучаны характарыстыкі аб'ектаў, маршруты руху, месца размяшчэння вонкавага пажарнага водазабеспячэння.

«Для арганізацыі дзяжурства ў асноўны дзень галасавання 26 студзеня на выбарчых участках будзе задзейнічана пяць тысяч работнікаў органаў падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, — дадаў Аляксей Навіцкі. — Для перыядычнага кантролю падчас датэрміновага галасавання з 21 да 25 студзеня плануецца задзейнічаць 1600 работнікаў сістэмы МНС. Непасрэдна ў асноўны дзень галасавання ўсе работнікі органаў падраздзяленняў пяройдуць на ўзмоцнены варыянт нясення службы. На баявое дзяжурства заступяць 3700 ратавальнікаў, 1400 адзінак пажарнай ратавальнай тэхнікі».

«Наша задача падчас дзяжурства — не толькі кантроль за забеспячэннем пажарнай бяспекі, але і своечасовае выяўленне пажараў і іншых надзвычайных сітуацый, паведамленне пра іх, эвакуацыя людзей у выпадку іх узнікнення, тушэнне ўзніклых пажараў першаснымі сродкамі пажаратушэння, а таксама сустрэча падраздзяленняў МНС, аператыўнае рэагаванне на надзвычайныя сітуацыі і іншыя здарэнні. У цэлым, органы падраздзяленняў МНС гатовыя да забеспячэння бяспекі ў перыяд правядзення выбараў», — запэўніў Аляксей Навіцкі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

Тым часам

# Галоўны крытэрый — аб'ектыўнасць

## Міжнародныя назіральнікі пазнаёміліся з работай выбарчых камісій Міншчыны



Міжнародныя назіральнікі будуць удзельнічаць у маніторынгу як датэрміновага, так і асноўнага дня галасавання. Сярод тых, хто будзе назіраць за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, — **намеснік дырэктара Дэпартамента Выканаўчага камітэта СНД Ісламджан КАРЫМАЎ і саветнік Выканкама СНД Ірына ЦАЛІКАВЕЦ.** У чацвер яны сустрэліся з членамі Мінскай абласной камісіі па выбарах.

З назіральнікамі сустрэўся намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Ільясевіч. Ён праінфармаваў аб падрыхтоўцы да выбарчай кампаніі ў вобласці, аб пытаннях, якія выбаршчыкі адрасуюць мясцовым органам улады. Пытанні, як заўважыў Аляксандр Ільясевіч, традыцыйныя. У асноўным звароты датычацца тлумачэння парадку правядзення галасавання, якім чынам замацавацца за тым участкам, які бліжэй знаходзіцца адносна месца рэгістрацыі выбаршчыка, як можна прыйсці і прагаласаваць. Грамадзяне таксама ўдакладняюць графік работы камісій у перыяд датэрміновага галасавання.

Намеснік дырэктара Дэпартамента Выканаўчага камітэта СНД Ісламджан Карымаў паведаміў, што на сёння акрэдытавана больш як 300 міжнародных назіральнікаў ад краін СНД, у тым ліку 40 доўгатэрміновых з ліку Выканкама СНД і прадстаўнікоў дыпламатычных устаноў у рамках СНД у Мінску. «Усе яны вопытныя людзі, многія неаднаразова ўдзельнічалі ў выбарчых працэсах у якасці міжнародных назіральнікаў», — адзначыў Ісламджан Карымаў. Паводле яго слоў, галоўны крытэрый работы міжнародных назіральнікаў — аб'ектыўнасць: «Мы выходзім са сваіх назіранняў непасрэдна на месцах. Уся інфармацыя абагульняецца, перадаецца ў штаб, дзе і апрацоўваецца. Усе высновы будуць агучаны ў працэсе прэс-канферэнцыі ўжо пасля выбараў. Я хачу падкрэсліць, што мы не ўмешваемся ва ўнутраныя справы, у выбарчы працэс, не палітызуем сітуацыю, захоўваем палітычную нейтральнасць».

Пасля сустрэчы з кіраўніцтвам выбарчай камісіі Мінскай вобласці міжнародныя назіральнікі наведалі Слуцкі і Стаўбцоўскі раёны.

СУСТРЭЧЫ

# НАПЕРАДЗЕ — ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНЫ ВЫБАР

**У межах Адзінага дня інфармавання ў працоўных калектывах і студэнцкіх аўдыторыях абмяркоўвалі электаральную кампанію**

## «Няпросты перыяд нам дапамогуць прайсці толькі яднанне і згуртаванасць»

Менавіта такую думку выказаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ** на сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (ВДТУ). Падчас адкрытага дыялогу абмяркоўваліся асаблівасці і адрозненні выбарчых кампаній гэтага і мінулага гадоў, важнасць удзелу ў выбарах і шэраг іншых.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта расказаў удзельнікам сустрэчы аб станаўленні незалежнай і суверэннай Беларусі, аб працэсе, які ішоў на яго вачах. Ён падкрэсліў, што з-за цяперашняй напружанай геапалітычнай абстаноўкі за межамі краіны да нас усё часцей сталі прыязджаць мігранты ў пошуку стабільнасці і спакою. Наша дзяржава, прытрымліваючыся мірнай палітыкі, дае людзям доўгачаканы мір, спакой і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. У той час калі ў суседніх краінах спрабуюць ладзіць рознага роду каляровыя рэвалюцыі і разгойдваць іх звонку, у Беларусі народ не паддаецца на дэструктыў, які ідзе ад калектыўнага Захаду. «Толькі згуртаванасць і яднанне ўсяго беларускага народа, у тым ліку вакол нашага Прэзідэнта, нашых нацыянальных каштоўнасцяў, таго, што нам патрэбна такая краіна, бо ў нас іншай няма, дапамогуць, дадуць нам магчымасць прайсці гэты перыяд», — падкрэсліў Уладзімір Пярцоў.

## «Навучыцеся крытычна ставіцца да інфармацыі»

Такую параду працаўнікам УП «Мінскметрабуд» і ААТ «Мінскметрапраект» даў **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** падчас сустрэчы з калектывам на тэму: «Удзел у выбарах — права і грамадзянскі абавязак кожнага».

Падчас размовы міністр падрабязна расказаў пра этапы найважнейшай палітычнай падзеі гэтага года — выбараў Прэзідэнта. Ён падкрэсліў, што «гэтыя выбары мы праводзім для сябе, і мы пазбавіліся ад характэрнай рысы, калі нам неабходна было адабрэнне звонку, ад заходніх «партнёраў».

Асобную ўвагу міністр інфармацыі ўдзяліў сусветнай практыцы прымянення тэхналогій маніпулявання грамадскай свядомасцю, а таксама дыпфэйкаў у сетцы інтэрнэт.

## «Беларусы ўсведамляюць высокую ступень яднання, якая ёсць у нашай дзяржаве»

Адзначыў намеснік **старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА** пасля сустрэчы з працоўным калектывам ААТ «Эксперыментальная база «Вольна».

Сяргей Хаменка таксама заўважыў, што Вольна — гэта населены пункт у Баранавіцкім раёне, які мае даўнюю гісторыю, што пачалася яшчэ ў XVI стагоддзі. «На гэтай зямлі жывуць людзі, якія захоўваюць свае традыцыі, памятаюць сваю гісторыю і разумеюць задачы, якія стаяць перад кожным грамадзянінам Беларусі», — падкрэсліў ён. І дадаў, што адбыўся дыялог з людзьмі, занятымі ў сельскай гаспадарцы, і яны выдатна разумеюць, што выбары — гэта, з аднаго боку, права кожнага чалавека, а з другога — грамадзянскі абавязак: выбраць сваю будучыню, ацаніць дзейнасць кіраўніка дзяржавы і тую карысць, якую ён прынёс Беларусі, а таксама намеціць перспектывы на будучыню.

**Паводле БелТА, прэс-службаў Міністэрства інфармацыі і Савета Рэспублікі.**